**І. В. Грабянчук, Д. В. Музыка**

# ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА Ў ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ БЕЛАРУСКАГА СТУДЭНЦТВА
(на прыкладзе мінскіх ВНУ)

У 2025 годзе Беларусь адзначае 80-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Гэты юбілей нагадвае нам пра гераізм і мужнасць тых, хто абараніў свабоду і незалежнасць нашай Радзімы. Аднак перамога – гэта не толькі вялікі подзвіг народа, але і асабістыя гісторыі сем'яў, з якіх складаецца трагічны летапіс вайны.

Суаўтары гэтага артыкула, якія належаць да розных пакаленняў, прытрымліваюцца агульнага пункту гледжання, што кожны чалавек павінен ведаць гісторыю сваёй сям'і: лёс сваіх дзядоў і прадзедаў, а затым свае веды перадаваць будучым пакаленням. Такія веды становяцца фундаментам калектыўнай памяці народа, яны дазваляюць нам глыбей зразумець гісторыю сваёй Бацькаўшчыны.

Для ўспрымання кожнай канкрэтнай асобай Другой сусветнай вайны, і Вялікай Айчыннай вайны як яе складовай часткі, першаснае значэнне мае тое, што мы даведваемся пра тыя далёкія драматычныя падзеі з сямейнай памяці. На жаль, вельмі часта так бывае, што інфармацыя на гэту тэму аказваецца недастаткова поўнай. Узнікае патрэба падмацаваць успаміны старэйшых членаў сям'і дакументальнымі крыніцамі. Пераходу на гэты якасна больш высокі ўзровень дапамагае навучанне ў сярэдняй школе. У гэтай справе выключна важная роля адведзена настаўнікам гісторыі, паколькі іх прафесійная кампетэнтнасць і грамадзянская пазіцыя абуджаюць шчырую зацікаўленасць школьнікаў да даследчыцкай працы. Такім натхняльнікам для малодшага аўтара гэтага артыкула – Дар'і Музыкі – стала яе настаўніца гісторыі і грамадазнаўства Таццяна Віктараўна Блешчава. Пачаўшы займацца даследчыцкай працай, Дар'я прымала ўдзел у краязнаўчых чытаннях «Гістарычная памяць народа: ад мінулага да будучыні» ў секцыі «Жывем, каб памятаць», удзельнічала ў розных канферэнцыях, прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне, дзе дзялілася вынікамі сваіх даследаванняў. Адным з такіх даследаванняў быў збор звестак пра лёс свайго прапрадзеда – Івана Пятровіча Шчуко – удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, які загінуў у жніўні 1944 г. на тэрыторыі Беластоцкай вобласці. Працягам такой работы стала апытанне школьнікаў пра тое, як падзеі той мінулай вайны адлюстраваны ў іх сямейнай памяці. Калі ж Дар'я Музыка стала студэнткай факультэта міжкультурных камунікацый Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, то з'явіліся падставы працягнуць такое даследаванне.

На аўдыторных занятках па дысцыпліне "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці" і пасяджэннях студэнцкага навуковага аб'яднання па гістарычным краязнаўстве мы вывучалі, што такое гістарычная памяць, як яна выяўляецца на індывідуальным і калектыўным узроўнях. У выніку з'явілася

патрэба даследаваць пытанне пра Вялікую Айчынную вайну ў гістарычнай памяці беларускага студэнцтва на канкрэтным эмпірычным матэрыяле, які неабходна было сабраць метадам апытання студэнтаў першага курса факультэта міжкультурных камунікацый МДЛУ, а таксама некаторых сталічных ВНУ, такіх як БДУ і БДУІР.

Першапачаткова мы правялі вывучэнне тэарэтычных асноў абранай тэмы для нашага даследавання. Яе фундаментальную аснову складае прававая норма, замацаваная ў частцы 2 артыкула 15 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь: “Дзяржава забяспечвае захаванне гістарычнай праўды і памяці аб гераічным подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны” [1, с. 5]. Наяўнасць дадзенай канстытуцыйнай нормы сведчыць пра тое, што ў XXI ст. асабліва важна забяспечыць захаванне гістарычнай памяці праз дзейнасць дзяржаўных органаў. Зыходзячы з гэтага палажэння будуецца палітыка дзяржавы, якая мае на мэце захаванне духоўных і гісторыка-культурных каштоўнасцей. Пра асаблівае значэнне гістарычнай памяці сведчыць артыкул 3 Закона Рэспублікі Беларусь ад 14 мая 2021 г. № 103-З “Аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму”, які сярод прынцыпаў недапушчэння рэабілітацыі нацызму на першае месца ставіць захаванне гістарычнай памяці і недапушчэнне фальсіфікацыі гісторыі, у тым ліку скажэння гістарычных фактаў [2].

З навуковых даследаванняў неабходна вылучыць агульнарэспубліканскае апытанне грамадскай думкі, якое было праведзена Інстытутам сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў лютым–сакавіку 2024 г. з мэтай вывучэння грамадскай думкі жыхароў Рэспублікі Беларусь пра Вялікую Айчынную вайну. Практычна кожны трэці ўдзельнік апытання (30,2 %) лічыць гэту вайну найбольш значнай падзеяй у гісторыі XX стагоддзя. Інфармацыю пра Вялікую Айчынную вайну жыхары краіны атрымліваюць з шырокага кола крыніц. Рэспандэнты адзначылі, што даведваюцца аб ключавых падзеях дадзенага трагічнага перыяду гісторыі з дакументальных (51,9 %) і мастацкіх (45,8 %) фільмаў. Акрамя гэтага, апытаныя атрымліваюць інфармацыю пра падрабязнасці ваенных дзеянняў з апавяданняў родных і блізкіх людзей (46,0 %), а таксама пры праглядзе праграм Беларускага тэлебачання (38,5 %) і чытанні мастацкай літаратуры пра вайну (38,5 %) [3]. Адпаведна, такая крыніца, як апавяданні родных і блізкіх людзей мае высокую ўдзельную вагу.

Амаль у кожнага другога беларуса дзяды і бабулі прымалі ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне (49,5 %), у кожнага пятага – іншыя сваякі (дзядзькі/цёткі, браты/сёстры) (20,9 %) і прадзеды, прабабулі (20,7 %). Паведамілі пра ўдзел у вайне сваіх бацькоў і маці 14,5 % рэспандэнтаў. Толькі 12,7 % жыхароў краіны паказалі, што ніхто з іх сваякоў не ваяваў. Не змаглі адказаць 5,3 % [3].

Пра тое, якое месца займае Вялікая Айчынная вайна ў гістарычнай памяці беларускай моладзі дае дастаткова поўнае ўяўленне артыкул беларускага гісторыка П. С. Кручака [4]. У ім аўтар паведамляе пра вынікі

пілатажнага сацыялагічнага даследавання, прысвечанага памяці пра Вялікую Айчынную вайну, рэалізаванага сумесна з навуковымі калектывамі Кубанскага дзяржаўнага ўніверсітэта і Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта ў красавіку–маі 2021 г. сярод моладзі Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь. Даследаванне паказала высокую ступень эмацыйнага водгуку моладзі на падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Сярод пачуццяў пераважаюць хваляванне, суперажыванне, а таксама шкадаванне аб ахвярах і непрыманне вайны ў цэлым як з'явы. Так 87,1 % маладых людзей адзначылі, што размовы пра вайну, фільмы на ваенную тэматыку, музыка ваенных гадоў выклікаюць пачуцці хвалявання і суперажывання [4, с. 35].

На пытанне аб тым, што ведаюць маладыя людзі пра сваіх родных і блізкіх, якія ўдзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне, 33,9 % адказалі, што шмат ведаюць пра гэта з аповедаў блізкіх і з сямейных архіваў. 32,2 % рэспадэнтаў паказалі, што ведаюць пра тое, што іх родныя ваявалі, але падрабязнасці ім невядомыя. Яшчэ 14,6 % апытаных ведаюць, што іх родныя ўдзельнічалі ў вайне, загінулі або прапалі без вестак. Такім чынам, вынікі дадзенага сацыялагічнага апытання даюць падставу канстатаваць, што Вялікая Айчынная вайна займае важнае месца ў гістарычнай памяці беларускай моладзі [4, с. 35].

Высветліўшы, якое месца займае Вялікая Айчынная вайна ў гістарычнай памяці беларускага соцыуму і моладзі як яго арганічнай часткі, мы перайшлі да практычнай часткі нашага даследавання, каб зразумець, якое значэнне мае гэта тэма ўжо ў асяроддзі студэнтаў сталічных ВНУ, і ў першую чаргу – Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта.

Быў апытаны 51 студэнт 1 курса ФМК МДЛУ, БДУ і БДУІР. Вынікі гэтага апытання пададзены ніжэй у наступнай інфаграфіцы.




Мал. 1. Пытанне аб неабходнасці размаўляць з дзецьмі пра Вялікую Айчынную вайну

Большасць рэспандэнтаў (59 %) лічыць, што размовы пра Вялікую Айчынную вайну з дзецьмі варта пачынаць з пэўнага ўзросту. 29 % апытаных падтрымліваюць неабходнасць такіх размоў, у той час як толькі 2 % адмаўляюць іх важнасць. Гэта сведчыць пра ўсведамленне моладдзю значэння гістарычнай памяці.




Мал. 2. Пытанне аб пачуцці нацыянальнай гордасці за подзвігі продкаў

80 % рэспандэнтаў выказалі гонар за Радзіму, што падкрэслівае моцную сувязь паміж гістарычнай памяццю і нацыянальнай ідэнтычнасцю. Толькі 4 % адказалі адмоўна, што можа сведчыць пра розныя погляды на гістарычныя падзеі.




Мал. 3. Пытанне аб наяўнасці ўдзельнікаў ВАВ сярод членаў сям’і

Пераважная большасць (82 %) пацвердзілі ўдзел сваякоў у Вялікай Айчыннай вайне, што падкрэслівае вялікі ўплыў вайны на сямейную памяць грамадзян Беларусі. Толькі 8 % не ведаюць пра такі факт, што можа быць звязана з стратай гістарычных звестак.




Мал. 4. Пытанне аб лёсе тых, хто ўдзельнічаў у вайне

39 % рэспандэнтаў паказалі, што іх сваякі вярнуліся з фронту, 22 % – што яны загінулі, а 16 % адказалі, што іх родныя зніклі без вестак. 23 % не змаглі даць дакладнага адказу, што падкрэслівае неабходнасць дапаўнення сямейнай памяці архіўнымі і іншымі дакументальнымі крыніцамі.




Мал. 5. Пытанне аб веданні месцаў службы ці баёў продкаў

Толькі 37 % апытаных ведаюць месцы баявых дзеянняў сваіх продкаў, у той час як 41 % не мае дакладных звестак, што кажа пра недахоп інфармацыі ў сямейных архівах і дапаўняе тэму, закранутую ў папярэднім пытанні.




Мал. 6. Пытанне аб спосабах пошуку інфармацыі пра ваенную гісторыю сям'і

55 % рэспандэнтаў звярнуцца да родных, што сведчыць пра іх імкненне да пошуку звестак з той крыніцы, якая ім найбольш блізкая. 12 % плануюць звярнуцца ў архівы, а 16 % адмовяцца ад пошуку, што паказвае на розныя падыходы да захавання гістарычнай памяці ў сям'і.




Мал. 7. Пытанне аб наяўнасці сямейных архіваў ваеннага перыяду

Прыблізна палова (49 %) апытаных захавалі дакументы, але 35 % іх не маюць. Гэта сведчыць пра тое, што з цягам часу было страчана шмат гістарычных крыніц асабістага паходжання і падкрэслівае каштоўнасць таго, што ўдалося зберагчы, таму гэтыя звесткі неабходна клапатліва захоўваць.




Мал. 8. Пытанне аб захаваных сямейных рэліквіях ваеннага часу

Найбольш распаўсюджанымі артэфактамі з’яўляюцца фотаздымкі (37 %) і ўзнагароды (23 %). Лісты з фронту захаваліся ў 15 % выпадкаў, што паказвае на іх гістарычную каштоўнасць.




Мал. 9. Пытанне аб гатоўнасці падзяліцца сямейнай ваеннай гісторыяй

Толькі 14 % гатовыя расказаць гісторыю сваёй сям’і, у той час як 49 % няўпэўнены ў гэтым. 37 % адмаўляюцца, што можа быць звязана з асабістымі прычынамі або стратай дакладнай інфармацыі.

Праведзенае апытанне сярод студэнтаў МДЛУ, БДУ і БДУІР паказала, што большасць рэспандэнтаў (82 %) маюць сваякоў-удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Аднак толькі 33,9 % апытаных валодаюць падрабязнымі звесткамі пра іх лёс, што паказвае на страты ў сямейнай памяці. Асноўнымі крыніцамі ведаў з'яўляюцца апавяданні родных (55 %). Эмацыйны водгук моладзі на падзеі вайны выяўляецца праз пачуцці хвалявання (87,1 %), што

падкрэслівае значэнне гэтай тэмы для сучаснага пакалення. Нягледзячы на недастатковыя звесткі, большасць рэспандэнтаў выказала жаданне даведацца больш, што пацвярджае актуальнасць працягу даследчай працы. Сучасныя метады пошуку дазваляюць аднаўляць інфармацыю хутка і дакладна, што адкрывае новыя магчымасці для захавання гістарычнай памяці. Вынікі даследавання падкрэсліваюць неабходнасць захавання і перадачы ведаў пра подзвіг продкаў як асновы калектыўнай памяці народа.

ЛІТАРАТУРА

1. Конституция Республики Беларусь : с изм. и доп., принятыми на респ. референдумах 24 нояб. 1996 г., 17 окт. 2004 г. и 27 февр. 2022 г. – Минск : Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь, 2022. – 109 с.

2. О недопущении реабилитации нацизма : Закон Респ. Беларусь от 14 мая 2021 г. № 103-З // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – URL: http://pravo.by/document/?guid=12551&p0=H12100103 (дата обращения: 05.05.2025).

3. Историческая память в социологическом измерении: к 80-летию освобождения Беларуси // Ин-т социологии НАН Беларуси. – URL: https://socio.bas-net.by/istoricheskaya-pamyat-v-sotsiologicheskom-izmerenii-k-80-letiyu-osvobozhdeniya-belarusi/ (дата обращения: 05.05.2025).

4. *Кручак, П. С.* Вялікая Айчынная вайна ў гістарычнай памяці беларускай моладзі / П. С. Кручак // Копытинские чтения – V: сб. ст. Междунар. науч.-практ. конф., г. Могилев, 23–24 марта 2022 г. / МГУ им. А. А. Кулешова ; под общ. ред. В. В. Табунова, А. М. Авласовича. – Могилёв, 2022. – С. 34–35.